Аляксандр Лакотка

доктар гістарычных навук,
доктар архітэктуры,
член-карэспандэнт НАН Беларусі,
дырэктар Інстытута мастацтва-знаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Развіццё нацыянальнай культуры — адна з прыярытэтных задач гуманітарнай навукі

Станаўленне маладой суверэннай сучаснай Беларусі выпала на складаны час глабальных крызісных з'яў, у якіх апынуўся свет пасля распаду СССР. Супярэчнасці паміж глабальным і нацыянальным, традыцыяй і мадэрнізацыяй, спажывецкім і духоўным ставяць пытанне аб ролі і значэнні гуманітарных навук у захаванні стабільнасці і далейшага развіцця сусветнай цывілізацыі. Міжэтнічныя і міжканфесійныя канфлікты, эканамічныя крызісы выклікаюць неспакой за захаванне маральных агульначалавечых каштоўнасцей, за трываласць падмурка, на якім стаяць спрадвечныя асновы асобы, грамадства, народа, чалавецтва.

На IV Усебеларускім народным сходзе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падкрэсліў, што культура — неад'емны складнік суверэнітэту. «Дабрабыт нацыі, — сказаў Кіраўнік дзяржавы, — вызначаецца яе эканамічным патэнцыялам. Зразумела, што без яго няма моцнай дзяржавы. Але і без развіцця духоўнай культуры таксама няма дзяржавы... Культура фарміруе дух нацыі! Вось чаму на пярэдні план ставіцца задача выхавання сумленнага чалавека, захавання і ўмацавання культурных і ідэалагічных асноў дзяржавы і грамадства» [1].

На фоне 60-гадовага будаўніцтва Еўрапейскага Саюза ў Еўрапейскім Савеце па культуры паўстала пытанне аб захаванні моўнай і культурнай разнастайнасці. І гэта падаецца сімптаматычным, калі ўспомніць канвенцыі

ЮНЕСКА, прынятыя за гэты ж час: «Аб ахове культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту» (1954 г.); «Аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага вывазу, увозу і перадачы правоў уласнасці на культурныя каштоўнасці» (1970 г.); «Аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны» (1972 г.); «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны» (2003 г.); «Аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення» (2005 г.) [2—6].

Захаванне народных традыцый, мовы, самасвядомасці сёння выступае гарантам устойлівага прагрэсу сучаснай гуманітарнай прасторы чалавецтва. Падмуркам развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці, эканомікі, культуры з'яўляюцца гуманітарныя навукі. Гісторыя, этналогія, фальклarystыка, мовазнаўства забяспечваюць развіццё патрыятызму, ідэйнай свядомасці, пачуццяў гордасці, высокага гістарычнага прызначэння народа: народа-пераможцы, народа-змагара, стваральніка сваёй будучыні.

Беларускі народ стварыў за стагоддзі ўнікальны светапогляд пра прыроду і сусвет, пра чалавека і бытнасць. Народная творчасць, народна-традыцыйнае мастацтва, духоўныя традыцыі грунтуюцца на талерантнасці, моўным і рэлігійным паразуменні, лепшых традыцыях сямейнага і грамадскага побыту, святасці мацярынства, гонару стваральнай працы, любові да бацькоўскай хаты, роднай зямлі, Радзімы. Народ сучаснай незалежнай Беларусі — народ горды, адкрыты, гасцінны, па-сяброўску ветлівы для тых, хто ідзе да нас з мірам і дзелавымі прапановамі.

Але калі інжынерная думка і тэхналагічны прагрэс не ведаюць нацыянальных і дзяржаўных межаў, то гісторыю і мастацтва, мову і філасофію беларусаў ніхто, акрамя нас, вывучаць не будзе. А без даследаванняў у сферы гуманітарных навук немагчыма стварэнне мадэлі сацыяльна арыентаванага ўстойлівага інавацыйнага развіцця, немагчыма выхаваць інжынера, узброіць метадалогіяй вучонага, пазбавіць маральнага старэння новыя машыны, зрабіць эканамічны прагноз.

У Рэспубліцы Беларусь шмат увагі надаецца раскрыццю ідэйнага патэнцыялу падзей і з'яў культурнага жыцця. Вялікім патрыятычным гучаннем напоўнены дзяржаўныя святы: Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга, якія праходзяць з шырокім удзелам кіраўніцтва краіны. За гады найноўшай гісторыі суверэннай Рэспублікі Беларусь новыя, сучасныя рысы набыло такое традыцыйнае свята, як Дажынкі.

Дзяржаўны клопат аб развіцці культуры і мастацтваў відавочны ў такіх храмах айчыннай культуры, як Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Палацава-паркавы ансамбль у г. Нясвіжы, Замкавы комплекс «Мір», Косаўскі і Ружанскі палацы, Дзяржаўны цырк,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сядзібны дом у в. Чырвоны Бераг і іншых аб'ектах спадчыны. Ажыццяўляецца рэстаўрацыя Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы, палаца ў в. Жылічы, замка ў г. Лідзе, рэшткаў былога замка ў в. Гальшаны.

Культура любога народа ахоплівае як матэрыяльныя, так і духоўныя (нематэрыяльныя) праяўленні творчасці чалавека, якія ў комплексе ствараюць своеасаблівую сістэму этнічнай і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Гэтая культурна-духоўная прастора арганізуецца з дапамогай не толькі пісьмовых паведамленняў, але і «мнеманічных сімвалаў», што ўтвараюць найбольш глыбінны пласт калектыўнай памяці. Да іх адносяцца прыродныя і створаныя чалавекам аб’екты, а таксама дзеянні (рытуалы, урачыстасці), звязаныя з імі. Таму адна з важнейшых задач вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у галіне нематэрыяльнай культуры — прадухіляць тыражыраванне ў сродках масавай інфармацыі непрафесійных і памылковых тлумачэнняў духоўнай спадчыны, скажэння міфалогіі, абрадаў, свят і г. д. Навуковымі ўстановамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сумесна з арганізацыямі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у рамках прынятай 25.03.2010 г. Праграмы навуковага супрацоўніцтва на 2010—2015 гг. вялася работа па ўдасканаленню заканадаўства па пытаннях аховы помнікаў, праводзіліся экспертызы па наданню помнікам статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Праведзена комплекснае натурнае даследаванне помнікаў народнага дойлідства ў Магілёўскай, Гомельскай, Мінскай і Віцебскай абласцях для Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Распрацавана канцэпцыя развіцця музейнай экспазіцыі. Створаны навукова-практычныя распрацоўкі па асваенню беларускага музычнага канцэртна-выканальніцкага мастацтва і метадычныя рэкамендацыі па яго ўкараненню.



Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы праведзена Міжнародная навуковая канферэнцыя «Сусветная фальклорная спадчына: мінулае, сучаснасць, перспектыўныя напрамкі даследаванняў» з удзелам вучоных з краін Еўропы, ЗША, Канады, Аўстраліі. Праведзена кансультатыўная сустрэча і трэнінг ЮНЕСКА для экспертаў краін СНД «Умацаванне нацыянальнага патэнцыялу па захаванню нематэрыяльнай культурнай спадчыны», накіраваная на ўдасканаленне метадалогіі і актывізацыю работы па стварэнню нацыянальных інвентароў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў кожнай з краін СНД. Створана электронная база даных помнікаў духоўнай культуры на падставе калекцыі фальклорных запісаў, структурыраваная з улікам рэгіянальнай спецыфікі беларускага фальклору па Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Супрацоўнікі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы выступілі арганізатарамі і ўдзельнікамі шэрага акцый: 3-і Рэспубліканскі фестываль-ярмарка рамёстваў «Вясновы букет», 2-е Рэспубліканскае свята-конкурс выцінанкі «Чароўныя нажніцы», 4-е абласное свята-конкурс «Разьбы зачараванне» ў г. Мядзелі, 3-е абласное свята-конкурс пояса і выцінанкі «Умельцы», абласное свята-конкурс драўлянай скульптуры «Сонечная цеплыня дрэва» ў г. Барысаве, 8-ы Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур у г. Гродна, Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» і інш.

Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі выдадзены чарговыя тамы з серый «Беларусы», «Гарады і вёскі Беларусі». Падрыхтавана і выдадзена праграма «Усеагульная гісторыя мастацтваў» для рэспубліканскіх школ з паглыбленым вывучэннем архітэктуры і мастацтва, а таксама вучэбны дапаможнік для ўстаноў вышэйшай адукацыі «Гісторыя беларускага мастацтва» ў 2-х тамах, буйныя манаграфіі «Экран і культурная спадчына Беларусі», «Беларускае народнае мастацтва».

У рамках Праграмы былі праведзены сумесныя з установамі Міністэрства культуры Міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі «Актуальныя праблемы мастацтва: гісторыя, тэорыя, методыка» (7—8 красавіка 2011 г.), «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтва» (10—11 лістапада 2011 г.), Рэспубліканскі навукова-практычны семінар «Культурная спадчына як духоўная каштоўнасць у выхаванні і развіцці дзяцей і моладзі» (10 сакавіка 2010 г.). Першая Рэгіянальная сустрэча экспертаў у рамках праекта ЮНЕСКА «Мастацкая адукацыя ў краінах СНД: пытанні і перспектывы развіцця творчага патэнцыялу ў XXI стагоддзі» (18—20 лютага 2010 г.).



Былі праведзены навукова-практычныя семінары для работнікаў аддзелаў культуры, дырэктараў дамоў рамёстваў, метадыстаў па традыцыйнай культуры АНМЦ, РМЦ, музейных работнікаў краязнаўчых і этнаграфічных музеяў, семінар-практыкум у г. Магілёве для работнікаў дамоў рамёстваў і музеяў.

Працяг работ па Праграме супрацоўніцтва паміж Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь праходзіць ва ўмовах рэфармавання навуковай сферы. Перад гуманітарнай навукай стаяць задачы даследавання фундаментальных праблем, з разлікам на вынік, актуальныя як для сучаснасці, так і на перспектыву.

Адной з такіх праблем з'яўляецца пазіцыянаванне нацыянальнай культуры ў рамках СНД, Еўропы, сусветнай супольнасці. Суадносінасць Беларусь і Свет у культурнай прасторы патрабуе акрэсленасці. Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сёння не за жалезнай заслонай, а краіна адкрытая, прывабная і камфортная. Глабалізацыя і культурны абмен, камерцыялізацыя культуры і стракатасць культурнага рынку не павінны скажаць агульныя і рэгіянальныя рысы нацыянальнай культуры. Тэатр, опера, канцэртная сфера, музеі павінны працаваць не на прывоз, а наадварот, на экспарт пастановак, спектакляў, канцэртаў, выставак. Параўнальна невялікая выстаўка традыцыйнага касцюма аддзела старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі ў Англіі і Францыі паказала, што гэта можна рабіць з поспехам.

Шэраг актуальных фундаментальных навуковых праблем таксама тычыцца тэарэтычных аспектаў. Некалі ў СССР дактрынай нацыянальнай палітыкі выступала ідэя новай гісторыі супольнасці — савецкага народа. Аднак пасля распаду СССР прайшло 20 гадоў. У новым сучасным свеце для суверэнных незалежных краін патрэбны новыя фундаментальныя навуковыя вызначэнні паняццяў народ, этнас, традыцыя, нацыянальная ідэя. Даследаванні пазначаных фундаментальных асноў павінны быць непарыўнымі. Варта прыпыніцца, і адразу з мінулага ўсплывуць разважанні пра субстраты, пра прыналежнасць сацыяльнай эліты, пра праваслаўную і каталіцкую, рускамоўную і польскамоўную Беларусь. Так, наш народ поліэтнічны, згуртаваны, але гэта адзіны беларускі народ, народ незалежнай суверэннай дзяржавы.



У галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны відавочны дасягненні ў стварэнні ахоўных зон гістарычных цэнтраў гарадоў, у рэстаўрацыі помнікаў манументальнай архітэктуры, замкаў і палацаў. Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі ініцыіравана Праграма аховы і рэстаўрацыі старажытных паркаў, іх музеефікацыі і выкарыстання для турыстычных мэт. Ёсць план мерапрыемстваў, зацверджаны Урадам краіны. Інстытутам падрыхтаваны праект Праграмы ўвекавечвання памяці знакамітых імёнаў дзеячаў навукі, культуры і мастацтва Беларусі на 2013—2025 гг.

Актуальнай праблемай з'яўляецца ахова помнікаў народнага дойлідства, гістарычных прадмесцяў гарадоў, гістарычных вёсак. Гэта крыніца для захавання рэгіянальных і лакальных адметнасцей аграгарадкоў, сядзіб агратурызму, аднаўляемых археалагічных форм (брам, вежаў і інш.). Сёння аграсядзібы з ацыліндраванай драўніны пад металадахоўкай ганьбяць народнае дойлідства, выглядаюць цацачнымі недарэчнасцямі.

Інстытут узначальвае навуковае суправаджэнне Праграмы аднаўлення вытворчасці ўнікальнага ўзору нацыянальнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — слуцкіх паясоў.

Наспела пара стварэння нацыянальнага інвентару нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, стварэння Зводу рухомых помнікаў гісторыі і культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Далейшых даследаванняў патрабуюць праблемы прафесійнага мастацтва. Чакаюць адказаў на пытанні адсутнасць сюжэтна-тэматычных палотнаў у жывапісе, аднаўлення пастановак нацыянальнай музычнай класікі, твораў М. Аладава, Я. Глебава, Р. Пуксты, актуальных драматычных п’ес, аўтарскай музыкі ў драматычных спектаклях і г. д. Наўрад на ўсё гэта можа быць адзіны адказ — умовы рынку. Калі кіравацца толькі на рынак, то, сапраўды, гледачам застанецца ў тэатрах і на канцэртах толькі бавіць час, нічога не атрымаўшы для розуму і душы. У людзях павінна выхоўвацца цікавасць не да відовішча, а творчай школы і напрамку, любімага майстра сцэны, мастака, рэжысёра, класікі.

Праблемы поп-культуры, шоу-бізнесу, суадносінасці авангарду і традыцый патрабуюць сацыяльнага, гістарычнага, філасофскага, мастацтвазнаўчага асэнсавання. Неабходны і такі напрамак даследаванняў, як эканоміка культуры.

У выніку комплексных навуковых даследаванняў у рамках навуковага супрацоўніцтва НАН Беларусі і Міністэрства культуры на 2010—2015 гг. павінна быць складзена канцэпцыя ўстойлівага культурнага развіцця, незалежнага ад знешніх уздзеянняў, канцэпцыя культуры, якая захоўвае самабытнасць, нацыянальны твар, успрымае лепшыя прагрэсіўныя дасягненні сучаснасці, забяспечвае сацыяльны аптымізм, высокую грамадзянскую свядомасць.



*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Доклад Президента Республики Беларусь Александра Лукашенко на четвёртом Всебелорусском народном собрании [Электронный ресурс]. — Режим доступа : www.president.gov.by/press101782.htm#doc. — Дата доступа : 21.07.2011.
2. Конвенция «О защите культурных ценностей в случае вооруженного конфликта» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.spravka-jurist.com/base/part-rq/tx_xswtfy.htm. — Дата доступа : 21.07.2011.
3. Конвенция «О мерах, направленных на запрет и предупреждение незаконного вывоза, ввоза и передачи прав собственности на культурные ценности» [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://docs.pravo.ru/document/view/19708675/. — Дата доступа : 21.07.2011.
4. Конвенция «Об охране всемирного культурного и природного наследия» [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://whc.unesco.org/archive/convention-ru.pdf. — Дата доступа : 21.07.2011.
5. Международная конвенция об охране нематериального культурного наследия. Основные тексты. — Люксембург, 2011. — 103 с.
6. Конвенция «Об охране и поощрении разнообразия форм культурного самовыражения» [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://www.ifapcom.ru/files/Documents/conv_cult_expression.pdf. — Дата доступа : 21.07.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ